**МІНІСТЭРСТВА ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

пр-т Пераможцаў, 11, 220004, г. Мінск
тэл./факс +375 17 203 92 31, +375 17 203 34 35
e-mail: info@mininform.gov.by

**МИНИСТЕРСТВО ИНФОРМАЦИИ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**

пр-т Победителей, 11, 220004, г. Минск
тел./факс +375 17 203 92 31, +375 17 203 34 35
e-mail: info@mininform.gov.by

19.09.2024 № 01-14/154-кол.
На № _________ от _________

[redacted]

(для інфармавання астатніх заяўнікаў)

Аб разглядзе звароту

У Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь ваш зварот разгледжаны ў межах кампетэнцыі.

Паведамляем, што ў адпаведнасці з пунктам 1 артыкула 9 Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 ліпеня 2008 г. № 427-З "Аб сродках масавай інфармацыі" (далей – Закон аб СМІ) масавая інфармацыя можа распаўсюджвацца ў Рэспубліцы Беларусь на дзяржаўных мовах Рэспублікі Беларусь і на іншых мовах.

У адпаведнасці з артыкулам 27 Закона Рэспублікі Беларусь ад 26 студзеня 1990 г. № 3094-XI "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" (далей – Закон аб мовах) у Рэспубліцы Беларусь мовамі сродкаў масавай інфармацыі з'яўляюцца беларуская і (або) руская, а таксама мовы іншых народаў, прадстаўнікі якіх жывуць у рэспубліцы.

Артыкул 29 Закона аб мовах вызначае, таксама што рэклама на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь размяшчаецца (распаўсюджваецца) на беларускай і (або) рускай мовах. Гэта палажэнне не распаўсюджваецца на рэкламу, што размяшчаецца (распаўсюджваецца) на радыё, тэлебачанні, у друкаваных выданнях і на інфармацыйных рэсурсах нацыянальнага сегмента глабальнай камп'ютарнай сеткі Інтэрнэт, якія размяшчаюць (распаўсюджваюць) інфармацыю выключна на замежных мовах, рэкламу таварных знакаў і (або) знакаў абслугоўвання, а таксама на рэкламу, што змяшчае агульнапрынятыя замежныя тэрміны і абазначэнні, якія ўвайшлі ў прымяненне ў арыгінальным напісанні і (або) не маюць абазначэння на беларускай і (або) рускай мовах, выкананыя на замежнай мове назвы тавараў, творчыя псеўданімы, арыгінальныя назвы творчых калектываў, твораў, культурных, спартыўных, спартыўна-масавых, турыстычных мерапрыемстваў, спаборніцтваў, конкурсаў, узнагарод, каманд спартсменаў, даменныя імёны сайтаў або запрашэнні на работу ці вучобу асоб, якія свабодна валодаюць замежнымі мовамі.

Такім чынам, рэдакцыі тэлепраграм маюць права самастойна вызначаць мову вяшчання і выкарыстання ў рэкламе (беларускую і (або)

рускую). Пры гэтым, у выпадку стварэння сеткі вяшчання на дзвюх мовах, аб'ём кожнай з іх можа, у тым ліку, залежаць ад канцэпцыі вяшчання СМІ і пераваг аўдыторыі.

Адначасова звяртаем увагу, што ў адпаведнасці з артыкулам 20 Закона аб СМІ размяшчэнне (распаўсюджванне) рэкламы ў сродках масавай інфармацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам аб рэкламе.

Кантроль у галіне рэкламнай дзейнасці, у тым ліку ў сродках масавай інфармацыі, ажыццяўляе Міністэрства антыманапольнага рэгулявання і гандлю (артыкул 8 Закона Рэспублікі Беларусь ад 10 мая 2007 г. № 225-З "Аб рэкламе"). Да кампетэнцыі Мініінфарма гэтыя пытанні не аднесены.

Адказ на зварот можа быць абскарджаны ў парадку, прадугледжаным артыкулам 20 Закона Рэспублікі Беларусь ад 18 ліпеня 2011 г. № 300-З "Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб".

Першы намеснік Міністра А.М.Кунцэвіч